3. Палякоў, М. Справаздача Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ на X з'ездзе / Дакл. т. М. Палякова; ЛКСМ Беларусі. Мінск : Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, 1931.
4. Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай рэспубліцы: Да X гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Мінск: Нацыянальны камісарыят ЦВК БССР, 1928.
5. Рэзалюцыі і пастановы VIII Усесаюзнага з'езда УсеЛКСМ і IX з'езда ЛКСМБ; 1928. Мінск : Чырвоная зьмена, 1928.
6. Тезисы докладов к VIII-му Всебелорусскому съезду ЛКСМБ. Минск., 1926.

**УДК 94(476)«1861/1914»+ 316.485**

# САЦЫЯЛЬНЫ КАНФЛІКТ ПАМІЖ БУЙНЫМІ ЗЕМЛЕЎЛАДАЛЬНІКАМІ І МАРГІНАЛЬНЫМІ КАТЭГОРЫЯМІ ШЛЯХТЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

***М. А. Крэнць***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, mkrents@bsu.by*

У артыкуле разглядаюцца асноўныя прычыны сацыяльнага канфлікту паміж буйнымі землеўладальнікамі і дробнай шляхтай на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Аналізуецца палітыка ўрада Расійскай імперыі і ўрадавыя мерапрыемствы. Аўтар прыходзіць да высновы, што прычынай канфлікту стала мэтанакіраваная палітыка ўрада і наступствы эканамічнага крызісу.

***Ключавыя словы***: *сацыяльны канфлікт; землеўладальнікі «польскага паходжання»; кантрыбуцыйныя мерапрыемствы; сацыяльная структура; абмежавальная палітыка; дробная шляхта.*

# СОЦИАЛЬНЫЙ КОНФЛИКТ МЕЖДУ КРУПНЫМИ ЗЕМЛЕВЛАДЕЛЬЦАМИ И МАРГИНАЛЬНЫМИ КАТЕГОРИЯМИ ШЛЯХТЫ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В КОНЦЕ XIX – НАЧАЛЕ XX в.

***М. А. Крентъ***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, mkrents@bsu.by*

В статье рассматриваются основные причины социального конфликта между крупными земледельцами и мелкой шляхтой на территории Беларуси

в конце XIX — начале XX века. Анализируются политика правительства Российской империи и правительственные меры. Автор приходит к выводу, что причиной конфликта стала целенаправленная государственная политика и последствия экономического кризиса.

***Ключевые слова***: *социальный конфликт; землевладельцы «польского происхождения»; контрибуционные мероприятия; социальная структура; ограничительная политика; мелкая шляхта.*

## THE SOCIAL CONFLICT BETWEEN THE LARGE LANDOWNERS AND THE PETTY GENTRY IN BELARUS IN THE LATE 19th – EARLY 20th CENTURIES

***M. Krents***

*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Ave., Minsk 220030, Belarus, mkrents@bsu.by*

The article analyses the main causes of social conflict between the large landowners and the petty gentry in Belarus in the late 19th and early 20th centuries. The policy of the Government of the Russian Empire and governmental measures are analysed. The author concluded that the conflict was caused by special governmental policies and the effects of an economic crisis.

***Keywords***: *social conflict; landowners "of Polish descent"; contribution measures; social structure; restrictive policy; petty gentry.*

У другой палове XIX ст. на тэрыторыі Беларусі адбываюцца карэнныя змены традыцыйнага ладу жыцця, сацыяльнай і эканамічнай структуры грамадства. Мадэрнізацыйныя працэсы характарызуюцца парушэннем традыцыйнай мадэлі сацыяльных інтэракцый, змяненнем эканамічнай структуры губерняў. Саслоўная прыналежнасць перастае адыгрываць значную ролю ў функцыянаванні грамадства, што суправаджаецца сацыяльнымі канфліктамі і супярэчнасцямі. На тэрыторыі беларускіх губерняў мадэрнізацыйныя працэсы праходзілі на фоне неадназначнай палітыкі ўрада, што выяўлялася ў абмежаванні эканамічных правоў землеўладальнікаў каталіцкага веравызнання.

У дадзеным артыкуле пастаўлена мэта вызначыць асноўныя прычыны сацыяльнага канфлікту паміж буйнымі землеўладальнікамі і дробнай шляхтай на тэрыторыі беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў.

Далучэнне тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. паставіла перад расійскім урадам некаторыя праблемы, сярод

якіх вылучалася задача інтэграцыі былой шляхты Рэчы Паспалітай у саслоўную сістэму расійскай дзяржавы. Справа ў тым, што ў Расійскай імперыі працэс кансалідацыі дваранства завяршыўся толькі ў XVIII ст., інстытут дваранства тут быў створаны для выканання адміністрацыйных і ваенных функцыі і рэгламентаваўся імператарам [1, с. 189-190]. Шляхта далучаных да імперыі беларускіх зямель уяўляла сабой шматлікую і стракатую па сваім сацыяльным складзе групу насельніцтва, пры гэтым 90–95 % ад агульнай колькасці шляхты складала яе дробная частка [1, с. 190]. Як адзначае А.Г. Каханоўскі, «Збяднелая дробная шляхта юрыдычна карысталася правамі свайго саслоўя, але не магла падтрымліваць той лад жыцця, які быў характэрны для дваранскага кола» [2, с. 82]. Такім чынам, сітуацыя патрабавала пэўных дзеянняў з боку расійскіх уладаў.

Ужо з моманту першых падзелаў Рэчы Паспалітай, расійскія ўлады прыступілі да выпрацоўкі мерапрыемстваў, якія дазволілі інтэграваць былую шляхту ў разрад расійскага дваранства шляхам фільтрацыі і прывядзенне агульнай колькасці шляхты да блізкага працэнта па імперыі. Як заўважае В.С. Макарэвіч, «Расійская манархія хоць і заявіла аб пашырэнні правоў расійскага дваранства на мясцовую шляхту, але жадала трымаць кантроль над яе колькасцю і ўпэўніцца ў сапраўднасці прыналежнасці яе да гэтага саслоўя. Ужо ў 1772 г. можна заўважыць першыя парасткі ў будучым доўгай і разгалінаванай палітыкі, якую з самага пачатку называлі разборам шляхты» [3, с. 30]. Такім чынам, працяглы час менавіта мерапрыемствы па разборы шляхты складалі найважнейшую частку сярод мер уздзеяння ўрада на «шляхту былой Рэчы Паспалітай».

Аднак дваранскае саслоўе на тэрыторыі беларускіх губерняў непакоіла расійскую манархію не толькі з прычыны сваёй шматлікасці і схільнасці да паўстання. Як адзначае Сэймур Бекер, «На тэрыторыі заходніх губерняў дваранства было самым шматлікім і найменш урбанізаваным, і тут жа доля рускіх сярод дваранства была найменшай [4, с. 293]». У адрозненне ад іншых губерняў Расійскай імперыі, колькасць рускіх землеўладальнікаў тут была нязначнай, у той час як польскі культурны ўплыў распаўсюджваўся на практычна ўсё дваранскае грамадства. Расійская публіцыстыка заклікала ўлады абмежаваць польскі ўплыў, а настроі ў палітычных колах імперыі ўсё

больш перамяшчаліся ў бок правядзення ўніфікацыйных і гамагенізуючых мерапрыемстваў на тэрыторыі заходніх губерняў.

Трыгерам да канчатковай змены сітуацыі стала паўстанне 1863 г. Прызначэнне на пасаду віленскага генерал-губернатара М. М. Мураўёва прывяло да змены расстаноўкі сіл у Заходнім камітэце спецыфічным органе кіравання заходнімі губернямі, перад якім ставілася задача распрацаваць мерапрыемствы, якія паклалі б канец сепаратысцкім тэндэнцыям і мелі б доўгатэрміновы характар. У хуткім часе мерапрыемствы, прапанаваныя М. М. Мураўёвым былі ўхвалены Заходнім камітэтам і адміністрацыя віленскага генерал-губернатарства прыступіла да іх ажыццяўлення.

Першым мерапрыемствам сталі кантрыбуцыйныя зборы грашовыя спагнанні з землеўладальнікаў, якіх віленскі генерал-губернатар разглядаў у якасці прыхільнікаў паўстання. Ідэя абавязковага і ўсеагульнага збору з землеўладальнікаў не знайшла падтрымкі абсалютнай большасці міністраў іх непакоіла перспектыва страціць давер лаяльных да Расійскай імперыі памешчыкаў. Аднак магчымы збор у такой сітуацыі не толькі вырашаў праблему недахопу фінансавых сродкаў у адміністрацыі віленскага генерал-губернатарства, але і пазбаўляў паўстанцаў магчымай фінансавай і матэрыяльнай дапамогі з боку землеўладальнікаў. 13 чэрвеня 1863 г. М.М. Мураўёў зацвердзіў спагнанне фінансавых сродкаў у памеры 10 % ад інвентарнага кошту маёмасці з усіх землеўладальнікаў [5, арк. 5].

20 жніўня 1863 г. з’явіўся праект кантрыбуцыйных збораў ў дачыненні да «маргіналізаванага дваранства», а ў кастрычніку 1863 г. адміністрацыя віленскага генерал-губернатарства распачала правядзенне дадзеных мерапрыемстваў [6, арк. 1]. Пад катэгорыяй «маргіналізаванага дваранства» расійскія ўлады разумелі асоб, якія былі пазбаўлены дваранскага статусу ці іх справы знаходзіліся пад разглядам. У дадзены разрад уваходзілі шматлікія прадстаўнікі дробнай, беззямельнай, чыншавай шляхты і аднадворцаў. 15 кастрычніка 1863 г. М. М. Мураўёў загадаў за два тыдня разабрацца з шляхецкімі аколіцамі і аднадворнымі таварыствамі. Збор усталёўваўся ў памеры 10 руб., а для нядобранадзейных – 25 руб. з двара, парадак той жа, што і пры 10 % зборы [5, арк. 60]. 9 лістапада 1863 г. М. М. Мураўёў адзначыў, што шмат хто з дробнай шляхты і аднадворцаў прымаў удзел у паўстанні і загадаў скласці спісы асоб, якіх

прадпісвалася выслаць для далейшага пераводу ва ўнутраныя губерні [5, арк. 61]. У 1864 г. кантрыбуцыі былі паменшаны да 5 руб.

23 лістапада 1864 г. М. М. Мураўёў запатрабаваў справаздачу ад мінскага губернатара па спагнанні збору з аколічнай (засценкавай), чыншавай і беззямельнай шляхты [7, арк. 62]. У справаздачы мінскі губернатар падкрэсліваў, што сярод дробнай шляхты знайшлося нямала асоб праваслаўнага веравызнання, а таксама адзначыў, што спаганяць збор з беззямельнай шляхты немагчыма, бо тая жыве вольнанаёмнай працай і часта змяняе месца жыхарства, а таму прапаноўваецца беззямельную шляхты наогул вызваліць ад збору [7, арк. 63]. 20 снежня 1864 г. беззямельную шляхту, як «людзей бедных, што набываюць сабе пражытак вольнанаёмнай працай», было вырашана вызваліць ад пяцірублёвага збору [7, арк. 78].

У далейшым, тэндэнцыі да вызвалення беззямельнай шляхты ад правядзення кантрыбуцыйных мерапрыемстваў былі працягнуты. 22 чэрвеня 1865 г. прадпісвалася «асоб са шляхты, у тым ліку навакольнай, якая пакуль запэўніла сваю добранадзейнасць вызваліць ад збору» [8, арк. 1]. З паступовай рэгламентацыяй і сістэматызацыяй кантрыбуцыйных збораў у заканадаўстве канчаткова замацавалася правіла, што асоба, якая перайшла з дваранскага саслоўя ў іншае вызвалялася ад выплаты кантрыбуцыйнага збору незалежна ад канфесійнай прыналежнасці. На справе, дадзены закон не заўсёды выконваўся на мясцовым узроўні. Напрыклад, у 1873 г. І. Тарасевіча, з былых аднадворцаў, селяніна каталіцкага веравызнання, вызвалілі ад выплаты кантрыбуцыйных збораў, але адмовілі ў складання нядоімкі [9, арк. 76]. Павятовы спраўнік сведчыў, што «ў палітычных адносінах Іван Тарасевіч добранадзейны, але з прычыны польскага паходжання ён не заслугоўвае павагі і складання нядоімкі» [9, арк. 76].

Такім чынам, напачатку 1870-х гг. прававое становішча асоб з ліку былой дробнай шляхты аказалася больш прывілеяваным, чым у землеўладальнікаў каталіцкага веравызнання. Пасля 1871 г. кантрыбуцыйнымі зборамі засталіся абкладзены толькі землеўладальнікі каталіцкага веравызнання з ліку дваранскага саслоўя і нядобранадзейныя элементы. Больш за тое, законам ад 1865 г. землеўладальнікам каталіцкага веравызнання забаранялася купляць зямельныя ўладанні на тэрыторыі заходніх губерняў. У законе дэкларавалася аб нязначнай долі польскага насельніцтва ў заходніх

губерняў, якая аказвае вялікі ўплыў на грамадскія настроі ў дадзеных губернях; тлумачылася, што па большай частцы польскае насельніцтва прадстаўлена памешчыкамі і мяшчанамі, і што дадзеная катэгорыя насельніцтва не дапускае пранікнення іншых нацыянальных груп у сваё асяроддзе з-за карпаратыўнай замкнёнасці [18, с. 327].

Становішча, у якім апынуліся землеўладальнікі каталіцкага веравызнання, прымушала іх шукаць новыя крыніцы павышэння рэнтабельнасці маёнтка або эканоміць на расходах. Праблемай у дадзеным выпадку былі не сумы кантрыбуцый, а нерацыянальныя метады вядзення гаспадарчай дзейнасці памешчыкамі, складанасці ў адаптацыі да ўмоў свабоднай канкурэнцыі. У 1863-1869 гг. кантрыбуцыйны збор у сярэднім складаў 30 ¼ капейкі за дзесяціну зямлі [7, арк. 9-11], пасля 1869 г. — 1,1-1,5 капейкі за десяціну зямлі (сума магла вар'іравацца ў залежнасці ад якасці зямлі, даходнасці, матэрыяльнага статусу, г. зн. у раскладках усе землеўладальнікі дзяліліся на 5 разрадаў) [11, арк. 3-369].

З мэтай эканоміі, буйнымі землеўладальнікамі прымаюцца дзеянні, накіраваныя на сістэмнае павышэнне арэндных выплат (сітуацыя пагаршалася і абмежаваннем на набыццё зямлі). Так, у сакавіку 1865 г. Радзівілы звярнуліся ў Сенат з прапановай зацвердзіць палажэнне аб «чыншавай шляхце», згодна з якім, калі ў вызначаны тэрмін не будзе дасягнута дамова аб арэндзе, у землеўладальнікаў з’яўляецца магчымасць выселяць чыншавікоў з фермаў і надзелаў [12, с. 118].

Складанасць дадзенага прававога прэцэдэнта ў тым, што землеўладальнікі выплачвалі кантрыбуцыі за ўсе зямельныя ўладанні, таму як кантрыбуцыйныя, так і пазямельныя выплаты залежалі ў тым ліку ад пагашэння чыншавікамі належных з іх выплат. У 1866 г. эканом маёнтка Багданішкі, які належаў Рамэрам, заўважаў, што выплаты па кантрыбуцыям прыходзіліся на той час, калі чыншавікі звычайны не ўносілі аніводнай капейкі [13, s. 24]. Варта заўважыць, што ў прыватнай перапісцы землеўладальніка і яго эканома, асаблівых нараканняў на сумы кантрыбуцый не прысутнічае.

Сярод прадстаўнікоў чыншавай шляхты былі як зацверджаныя Герольдыяй дваране, так і аднадворцы, мяшчане, вольныя людзі, сяляне, якія трымалі землі на аснове вечначыншавага права [14, с. 3]. Пэўную частку чыншавікоў складалі асобы, якія ніколі не належалі да шляхты – вольныя людзі, мяшчане, часам яўрэі, асабіста свабодныя

сяляне [14, с. 3]. Становішча чыншавікоў залежала ў шматлікім ад буйных землеўладальнікаў. Пасля сялянскай рэформы 1861 г., кантрыбуцыйных і абмежавальных мерапрыемстваў урада, узнікаюць пэўныя супярэчнасці ў адносінах буйных землеўладальнікаў, не задавальняла чыншавая форма рэнты за зямлю, і чыншавікоў. Безумоўна, эканамічная сітуацыя прымушала памешчыкаў эканоміць сродкі, павысілася і сама значнасць зямлі ў разуменні землеўладальнікаў каталіцкага веравызнання, якія былі пазбаўлены магчымасці яе пакупкі. Выхадам з дадзенага становішча па меркаванні землеўладальнікаў павінна была стаць ліквідацыя вечначыншавых адносін і перавод чыншавікоў на арэнду, з улікам рыначнага кошту на зямлю (большага за чынш) [14, с. 6].

Вынікам супрацьстаяння стала рэформа ад 9 чэрвеня 1886 г., паводле якой чыншавыя пазямельныя адносіны былі скасаваны, а для доказаў права на зямлю, чыншавікі павінны былі прадставіць адпаведныя дакументы [15, с. 275]. Па падліках В. П. Панюціча, у выніку рэформы 83,6 % чыншавікоў былі сагнаны з зямлі альбо пераведзены на арэнду [16, с. 40].

Дадзены канфлікт буйных землеўладальнікаў і чыншавікоў мае дзве асноўныя прычыны складанасці адаптацыі землеўладальнікаў да наступстваў сялянскай рэформы і асаблівасці ўнутранай палітыкі ўрада щ дачыненні да землеўладальнікаў каталіцкага веравызнання. Пэўным наступствам канфлікту стала тое, што адносна кансалідаваная на ўзроўні этнапалітычных прыярытэтаў катэгорыя былой шляхты Рэчы Паспалітай, апынулася падзеленай. Узнікае відавочны антаганізм сацыяльных і палітычных інтарэсаў буйных землеўладальнікаў і маргіналізаванай шляхты ў канцы XIX ст. Напачатку XX ст., у перыяд актывізацыі беларускага і польскага нацыянальнага руха, адчуваўся, як адзначала К. Скірмунт, «узаемны недавер шляхціча і магната» [17, s. 3].

Пры разглядзе прычын, якія прымусілі землеўладальнікаў пераглядаць арэндныя дамовы, варта таксама адзначыць і фактар аграрнага крызісу 1870-х – 1880-х гг. Справа ў тым што структурныя змены ва ўмовах вытворчасці і рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі прыводзяць да «рэвалюцыі кошту», да значнага зніжэння рынкавых цэн на сельскагаспадарчыя тавары. Пад уплывам устанаўлення новага ўзроўню цэн узнікае неабходнасць перагляду рэнты. Пры гэтых умовах рэнта выплачваецца за кошт далейшага

паніжэння заработнай платы работнікаў сельскай гаспадаркі, за кошт сярэдняга прыбытку і нават некампенсаванай часткі авансаваць капіталу, што вядзе да рэзкага абвастрэння сацыяльных супярэчнасцей і доўгага парушэння ўмоў узнаўлення сельскай гаспадаркі. Безумоўна, аграрны крызіс не з'яўляецца асноўным фактарам, які заахвочваў землеўладальнікаў да перагляду арэндных умоў, паколькі дадзеная тэндэнцыя прасочваецца яшчэ ў 1860-х гг., але наступствы крызісу спрыялі дадзеным інтарэсам буйных памешчыкаў.

Ва ўмовах актыўнага развіцця капіталістычных адносін, дастаткова хутка дыферэнцыравалася структура дваранства па сацыяльным, маёмасным, прававым статусе. Дадзеным працэсам спрыяла ўнутраная палітыка ўрада Расійскай імперыі. Як адзначае А. Г. Каханоўскі, «У рэалізацыі буржуазных рэформ 60—70-х гг. XIX ст., за выключэннем адмены прыгоннага права, адсутнічаў выразна саслоўны пачатак. Кожнае з чатырох саслоўяў не ўяўляла сабой кансалідаваную групу, а падзялялася на асобныя разрады, якія былі дастаткова рознымі па прававому становішчу» [18, с. 24].

Землеўладальнікі польскага паходжання розныя шляхі ўзбагачэння, у той момант як у дробных землеўладальнікаў не існавала для гэтага сродкаў. У сваіх мемуарах І. Корвін-Мілеўскі адзначае, што «ад 1880-ых гадоў руплівае гаспадаранне і ўдалыя аперацыі з каштоўнымі паперамі ўжо лічыліся мясцовым польскім землеўладальніцкім станам за патрыятычны абавязак» [19, s. 7]. Неабходнасць пераадолення неспрыяльных умоў гаспадарання патрабавала ад буйных землеўласнікаў пастаяннага тэхнічнага ўдасканалення і інвеставання ў новыя фабрыкі па перапрацоўцы мясцовай сыравіны. А. Цвікевіч заўважаў: «капіталізаваны польскі маёнтак у Беларусі зрабіўся прыкладам тэхнічнай высока-пастаўленай гаспадаркі, ператварыўся ў аграрнага культуртрэгера ў тэхнічна-адсталай і беднай капіталамі сялянскай Беларусі [20, с. 268]». У ведамасцях аб маёнтках асоб польскага паходжання з другой паловы 1870-х гг. прасочваецца павышэнне цікавасці да інвестыцый у фабрыкі, заводы і прапінацыі [21, арк. 3–57]. Нягледзячы на актыўнае развіццё фабрычна-завадской індустрыі, пераважную долю па аб'ёме вытворчасці і колькасці занятых рабочых складалі дробныя і невялікія прадпрыемствы з колькасцю наёмных работнікаў да 50 чалавек [22, с. 221]. Буйныя землеўладальнікі паступова прыстасоўваліся да новых

капіталістычных умоў гаспадарання ў адпаведнасці са вядомым тэзісам С. Ю. Вітэ: «у цяперашні час багацце даецца не зямлёй, а банкаўскай справай, прамысловасцю, вытворчасцю» [4, с. 91]. Прычына сацыяльнага канфлікту буйных землеўладальнікаў і маргіналізаваных дваран выяўлялася і ў розным становішчы, каторае займалі дадзеныя групы насельніцтва ў мадэрным грамадстве.

У сярэдзіне XIX ст. адбываліся значныя падзеі, якія карэнным чынам змянілі сацыяльнае, палітычнае і эканамічнае аблічча беларускіх губерняў. Пад уздзеяннем шэрагу фактараў змянялася структура дваранства беларускіх губерняў. Наступствы сялянскай рэформы 1861 г., кантрыбуцыйныя і абмежавальныя мерапрыемствы ўрада Расійскай імперыі, наступствы аграрнага крызісу ў сукупнасці змушалі землеўладальнікаў прыстасоўвацца пад новыя ўмовы. Канкурэнцыя на рынку, кантрыбуцыйныя мерапрыемствы матывавалі землеўладальнікаў да рацыяналізацыі гаспадарчай дзейнасці, павышэння прыбытковасці маёнткаў. Падобныя працэсы суправаджаліся разрывам традыцыйных прававых узаемаадносін буйных землеўладальнікаў і маргіналізаванай шляхты, прыводзілі да сацыяльнага антаганізму паміж імі. Да канца XIX ст. кансалідаваная ў этнапалітычным дачыненні шляхта былой Рэчы Паспалітай была раз’яднана. Сацыяльныя і палітычныя ўстаноўкі набліжалі асоб з ліку былой дробнай шляхты да сялянства. Дадзеныя фактары аказалі ўплыў на нацыянальныя працэсы канца XIX – пач. XX стст.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Каханоўскі, А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). Мінск: Беларус. дзярж. ун-т., 2013.

2. Каханоўскі, А. Г. Міжсаслоўная сацыяльная мабільнасць насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 7. 2012. С. 80–91.

3. Макарэвіч, В. С. Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII – XIX ст.). Мінск: Беларус. дзярж. ун–т., 2018.

4. Беккер, С. Миф о русском дворянстве: Дворянство и привилегии последнего периода императорской России / пер. с англ. Б. Пинскера. М.: Новое литературное обозрение, 2004.

5. Дело об обложении временным 10 % денежным сбором имений помещиков и дворян, принимавших участие в восстании 1863 г. или сочувствующие ему // Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). Ф. 296. Оп. 1. Д. 27.

6. Переписка об обложении шляхетских околиц и однодворческих обществ временным сбором, согласно предписанию Главного начальника // НИАБ. Ф. 295. Оп. 1. Д. 1517.
7. Дело о раскладке 5 % сбора на помещиков польского происхождения в Минской губернии // НАБ. Ф. 295. Оп. 1. Д. 1673.
8. О взыскании сборов с недвижимых имуществ лиц Польского и Еврейского происхождения // НИАБ. Ф. 1430. Оп. 1. Д. 32021.
9. Дело о лицах, недосказавших дворянское происхождение из лиц бывшей польской шляхты по временным % сборам // НИАБ. Ф. 1430. Оп. 1. Д. 35372.
10. О воспрещении лицам Польского происхождения вновь приобретать помещичьи имения в девяти западных губерниях № 42759 // ПСЗРИ. Собр. 2-е: в 55 т. – Спб., 1867. – Т. 40. – Отд. 2. – С. 326–327.
11. Раскладка поземельных сборов по Минскому губернии за 1878–1881 г. // НИАБ. Ф. 333 Оп. 1. Д. 3566.
12. Кохнович, В. А. Хозяйство в имениях на Полесье в 1861–1914 гг. Saarbrücken: Lambert Academic Publishing, 2015. 369 с.
13. Pamiętniki i listy polskich autorów z Ziem Zabranych (Litwa, Białoruś, Ukraina) w latach 1795–1918. T. III, seria: Kresy w polskich pamiętnikach i listach (1795–1918) / red. M. Domańska-Nogajczyk, T. Wójcik, Kielce, 2017.
14. Макарэвіч, В.С. “Панскі разбор шляхты”: абеззямельванне чыншавікоў у 2-ой палове XIX ст. і чыншавая рэформа ў 1886 г. у Беларусі // Беларус. гіст. часоп. 2011. № 4. С. 3–14.
15. Положение 9 июня 1886 года о поземельном устройстве сельских вечных чиншевиков в губерниях Западных и Белорусских, № 3789 // ПСЗРИ. Собр. 3-е: в 33 т. – СПб., 1886. – Т. 6. – С. 275–276.
16. Панютич, В.П. Социально–экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Минск: Навука і тэхніка, 1990.
17. Skirmuntt, K. O prawdę i zgodę z powodu głosu Litwinów do magnatów, obywateli i szlachty na Litwie i odpowiedzi młodego szlachcica litewskiego. Lwów : druk A. Goldmana, 1906.
18. Каханоўскі, А. Г. Уніфікацыя і русіфікацыя як накірункі ўрадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 6. 2011. С. 20–26
19. Korwin-Milewski, H. Siedemdziesiąt lat wspomnień (1855–1925). Poznań: Księgarnia Uniwersytecka, 1930.
20. Цьвікевіч, А. «Западно–руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. – 2–е выд. – Менск: Навука і тэхніка, 1993.
21. Ведомость об имениях, принадлежащих лицам польского происхождения у которых находятся оборочные имения // НИАБ. Ф. 2001. Оп. 1. Д. 1056.
22. Каханоўскі, А. Г. Разгортванне мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі ў XIX–XX ст. // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 4. Мінск: БДУ, 2009. С. 218–228.